УДК 94(476)«15»+32.019.5

**Я. Д. Алейнікаў, В. А. Міхедзька**
Гомельскі дзяржаўны
ўніверсітэт імя Ф. Скарыны

# “КАЛІ ХОЧАМ ДЗЯРЖАВУ ЎНУКАМ МЫ ПАКІНУЦЬ...”: ПАЛЕМІКА ВАКОЛ УНІІ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА З ПОЛЬШЧАЙ У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XVI СТАГОДДЗЯ

*У артыкуле разглядаецца грамадска-палітычная палеміка сярэдзіны XVI ст. паміж прыхільнікамі розных мадэляў уніі Вялікага княства Літоўскага і Польскага каралеўства. На фоне цяжкай вайны з Масквой і заняпаду дынастыі Гедзімінавічаў актывізаваліся дыскусіі аб будучым дзяржаўным ладзе. Аналізуюцца аргументы польскага боку (С. Ажахоўскі, П. Скарга), якія абгрунтоўвалі неабходнасць інкарпарацыі ВКЛ і дамінавання польскіх "свабод". Проціпастаўляюцца погляды літоўскіх мысліцеляў (А. Ратундус, А. Волан), якія адстойвалі раўнапраўны саюз і суверэнныя правы княства. Асобна вылучаюцца ўмераныя пазіцыі (А. Ф. Маджэўскі, М. Стрыйкоўскі) адносна цэнтралізацыі і агульнасці лёсу. Паказана, як гэтая палеміка спрыяла пошуку кампрамісу, замацаванага Люблінскай уніяй.*

Пачатак 60-х гадоў XVI ст. адзначыўся для Вялікага княства Літоўскага збегам складаных і цяжкавырашальных праблем. Цяжкая вайна з Маскоўскай дзяржавай, спусташэнне і захоп ёю велізарных тэрыторый на ўсходзе краіны спалучыліся з ужо відавочным на той час канцом старажытнай дынастыі Гедзімінавічаў, што з часоў Крэўскай уніі злучала Вялікае княства Літоўскае і Польскае каралеўства. “Палітычныя народы” абедзьвюх дзяржаў шукалі магчымасці для працягу саюзных адносін, маючы пры гэтым адрознае бачанне іх сутнасці і характару. Польскія сенатары ўжо ад самага пачатку самастойнага панавання Жыгімонта II Аўгуста у якасці адзінаасобнага манарха патрабавалі ад яго інкарпарацыі Вяліка княства Літоўскага ў склад Польскага каралеўства, спасылаючыся на літару акта Крэўскай уніі. 13 сакавіка 1564 г. на варшаўскім сейме кароль Жыгімонт II Аўгуст перадаў Кароне Каралеўства Польскага на вечныя часы свае і сваіх патэнцыйных сыноў спадчынныя правы на Вялікае княства Літоўскае. Мэтай гэтага акта кароль абвяшчаў пазбаўленне ад апошніх перашкодаў на шляху зліцця абодвух палітычных народаў у “адзінае цела” [1, s. 180]. Пры гэтым, аднак, палітычная эліта Вялікага княства Літоўскага не ішла так далёка ў сваім бачанні будучых адносін з Польшчай. Літоўскія паслы не з’явіліся на падпісанне прынятага на сейме “Зацвярджэння хады справы ўніі” [1, s. 181]. Адрознае бачанне будучага саюза і перад усім статуса Вялікага княства Літоўскага ў складзе будучай “Рэчы Паспалітай з гэтых народаў злучанай” выявілася ў напружанай палеміцы на старонках грамадска-палітычнай літаратуры.

Выразнае адлюстраванне поглядаў польскай палітычнай эліты на Вялікае княства Літоўскае і характар будучай уніі змешчана ў творы вядомага польскага грамадска-палітычнага і рэлігійнага дзеяча Станіслава Ажахоўскага “Quincunx” (тут – “Піраміда”), надрукаваным у Кракаве ў 1564 г. На старонках выдання С. Ажахоўскі падае Польшчу як прыклад і ўзор дзяржаўнага ўладкавання, – каралеўства, якое складаецца з пяці элементаў, сярод якіх дамінуе Царква, а вера, святар, алтар і кароль маюць аднолькавае значэнне. Кароль і шляхта ўтвараюць свабодны саюз, заснаваны на законах, якія кароль не можа парушаць. Шляхціц павінен удзельнічаць у паспалітым рушэнні і плаціць падымнае, але не мае ніякіх іншых абавязацельстваў перад каралём. Цяжкае становішча, у якім апынулася Вялікае княства, з пункту гледжання С. Ажахоўскага, не часовая з’ява, а ўласцівасць краіны нават у часы яе росквіту. “Прыгнечаныя” літвіны павінны прагнуць злучэння з Польшчай, каб дабіцца атрымання польскіх “свабод”: “Вольнасцю сваёй зраблю цябе, нявольніка, свабодным...”. Лад ВКЛ С. Ажахоўскі атаясамлівае з

Маскоўскім царствам і нават Асманскай імперыяй і падкрэслівае, што літвіны маюць вялікага князя не па сваёй волі, што ад яго рашэнняў не маюць аніякай прававой абароны па прычыне адсутнасці прыродных свабод. Палякі жа маюць свае прыродныя вольнасці, самі абіраюць караля, які ім прысягае на вернасць [2, с. 148-150].

Па меркаванні І. Саверчанкі, у сукупнасці погляды С. Ажахоўскага уяўляюць канцэпцыю "вольнага каралеўства і нявольнага княства". Вольная Польшча з грамадзянскай роўнасцю жыхароў супрацьпастаўляецца ВКЛ, для якога ўласцівы самаўладдзе і дэспатыя, а ўсе жыхары княства – няшчасныя жабракі. Кожны літвін залежыць ад кагосьці больш заможнага. Ніхто з літоўскага народу памерамі сваіх праў не зможа параўнацца нават з самым бедным палякам. С.Ажахоўскі настойваў на тым, што вялікі князь павінен дабраахвотна далучыць літоўскія землі да Польшчы. Сістэма дзяржаўных інстытуцый і заканадаўства павінна быць цалкам злучана з польскай: "Нявольная Літва не можа быць задзіночанай з вольнаю Польшчай, калі не будзе мець аднолькавай з ёй формы кіравання" [3, с. 148–150].

Фактычным адказам на адлюстраванае пастановамі польскіх соймаў бачанне будучай уніі стаўся надрукаваны ў Брэсце ў 1564 г. першы вядомы на сёння твор грамадска-палітычнай думкі Вялікага княства Літоўскага – "Размова Паляка з Літвінам". Аўтарам гэтага выдадзенага ананімна твору, як мяркуецца, з'яўляўся Аўгусцін Ратундус-Мялескі, каралеўскі сакратар і віленскі войт, удзельнік распрацоўкі ІІ-га і ІІІ-га Статутаў Вялікага княства Літоўскага. "Размова ...", як і змешчаны разам з ім верш А. Волана "Да палякаў і да ліцвінаў", аспрэчвала аргументы С. Ажахоўскага на карысць інкарпарацыі Вялікага княства Літоўскага ў склад Польскага каралеўства. Ратундус падкрэсліваў мужнасць літвінаў, іх адданасць роднаму краю, адзначаў упартасць у абароне ад нападаў маскавітаў і татар, як і тое, што палякам разам з літоўцамі нярэдка даводзілася стаяць разам на полі боя. Паміж тым узгадваецца і перамога Гедзіміна над Уладзіславам Лакеткам як сімвал таго, што літвіны здольныя адстойваць свае дзяржаву і свабоду. Аўтар адзначаў, што толькі ў вольнай краіне могуць нарадзіцца годныя і высокародныя грамадзяне, здольныя на ахвяраванне сваім жыццём, прыкладам якіх служыць Канстанцін Астрожскі. Такія фактары палітычнага і сацыяльна-культурнага жыцця як анархія, разбэшчанасць, абыякавасць, карупцыя, якія прыводзяць да заняпаду Вялікага княства Літоўскага, насамрэч былі прывезены з Польшчы. Сукупнасць адзначаных абставін прывяла да тэрытарыяльнага зменшання краіны ("праз тое Полацк загінуў"), а ў будучыні магло прывесці да страты дзяржаўнасці. У сваёй рабоце Ратундус падрабязна разглядаў гісторыю Вялікага княства, яго перамогі і дасягненні, робячы акцэнт на генезісе літоўскай шляхты (nobilitas generis), якая набыла свае маральныя абавязкі і вольнасці ад продкаў і з'яўляецца носьбітам стабільнасці і росквіту княства. Гаспадаром дзяржавы, на думку аўтара твору, павінен быць спадчынны манарх, які абавязаны захоўваць дынастычны аўтарытэт, замацаваны пачуццём адказнасці перад дзяржавай, перад сваімі продкамі і нашчадкамі, з чым цудоўна спраўляюцца прадстаўнікі роду Ягайлавічаў. Нягледзячы на дрэнны ўплыў Польшчы на жыццё Княства, аўтар не жадаў разрыву з ёй, выступаў за раўнапраўны саюз з палякамі: "Мы не жадаем, злучыўшыся з вамі, страціць нашай здаўна ўпарадкаванай і дагледжанай дзяржавы". Польскі бок ён заклікаў не дамагацца інкарпарацыі літоўскай дзяржавы, а дапамагчы ў барацьбе з Масквою [3, с. 74–81].

Да "Размовы... " быў дададзены паэтычны твор "Do Polakow i Litwinow" ("Да палякаў і да ліцвінаў"), які належаў пяру Андрэя Валяна, на той час сакратара Мікалая Радзівіла Рудага. У ім аўтар зрабіў акцэнт на важнасці гарманічнага і раўнапраўнага суіснавання продкаў абодвух народаў. Волан быў перакананы, што падмуркам іх моцы былі ўзаемная пашана, супольнае вырашэнне дзяржаўных пытанняў і адзінства пад уладай агульнага манарха. Паводле яго думкі, менавіта такія саюзы забяспечваюць росквіт краіны, бо "раўнапраўныя бакі заўсёды знойдуць шлях да згоды". Ён

папярэджваў, што палітыка прыгнёту, хлусні і крывадушнасці непазбежна разбурае адзінства. На думку творцы, пыха палякаў шкодзіць не толькі саюзу, але і вядзе да ўнутранага крызісу ў самой Польшчы. Аднак ён падкрэсліваў, што віна за разлад ляжыць не на ўсім польскім народзе, а на асобных дзеячах Кароны, якія мэтанакіравана сеялі варожасць. Адным з галоўных ворагам саюза ён лічыў С. Ажахоўскага, які распаўсюджваў міфы пра нібыта "прыгнечанае" становішча ліцвінаў ва ўласнай дзяржаве і навязваў ідэю "вызвалення" праз далучэнне да Польшчы: "Вядзе Паляк зацята ганьбу на Ліцвіна / І не хоча мець яго за годнага сына сваёй маткі, / Піша пра яго Quincunx-ы і дзіўныя вымыслы, / Якія са слабой галавы так неразумна выйшлі" [4, с. 115]. У фінале Волан заклікаў палякаў імкнуцца да сапраўднай грамадзянскай свабоды, а не да анархічнага свавольства, якое ён параўноўваў з распуснасцю. Завяршаецца твор заклікам да абодвух народаў аб'яднацца дзеля захавання моцнай дзяржавы для будучых пакаленняў, паколькі менавіта маральны заняпад і разлад станавіліся прычынай гібелі вялікіх царстваў [5, с. 516–517].

Яшчэ адным актыўным прыхільнікам інкарпарацыі з'яўляўся польскі тэолаг і пісьменнік Пётр Скарга. У сваёй кнізе "Аб адзінстве царквы Божай" Скарга заклікаў русінаў і літвінаў павярнуцца да фларэнційскіх пагадненняў, раіў каталіцкім святарам праводзіць сустрэчы з праваслаўным біскупствам, апекавацца асветніцкай справай, займацца перакладам рэлігійнай літаратуры для мясковых асоб, прапагандаваць царкоўную згоду і шкоднасць усходняй "схізмы" [6, с. 52]. Царкоўная ўнія павінна была стаць гарантам грамадскай і палітычнай стабільнасці ў Рэчы Паспалітай. Палітычныя погляды святар дэклараваў у "Сеймавых прамовах", дзе адстойваў ідэю аб тым, што грамадства для свайго станоўчага развіцця павінна падзяляцца на кіруючыя і падпарадкаваныя класы. Тэолаг выступаў за моцную каралеўскую ўладу і лічыў, што прававая і маёмасная дыферэнцыяцыя з'яўляецца справай натуральнай і ад таго справядлівай. Дзяржава павінна быць строга цэнтралізаванай і ўніфікаванай: "Айчына, як адзінае цела, не церпіць падзелаў. Яна злучылася з розных членаў: з палякаў, з літоўцаў, з русінаў, з прусаў, з інфлянтаў, са жмудзінаў, і зраслася ў адно цела". Усе некаталікі, на думку Скаргі, з'яўляюцца таму слупамі анархізму і эксплуатацыі сялянства. Асабліва негатыўнае стаўленне ён меў да антытрынітарыяў праз іх ідэю сацыяльнай роўнасці і крытыку традыцыйных дзяржаўных інстытутаў. Сцвярджаў, што пратэстантызм – сродак раскладання маральных нормаў. Скарга падкрэсліваў, што рэлігійная талеранцыя не ўласціва народам Рэчы Паспалітай і прыйшла з Германіі, што ў краінах, дзе пануюць ідэі пратэстантызма і праваслаўе, адбываюцца пастаянныя прыцясненні каталікоў. Паміж тым, не гледзячы на тое, што творца ставіў царкву вышэй за дзяржаву, у творах Скаргі прысутнічае думка, што нават у выпадку адступніцтва кіруючых асоб ад каталіцкага веравызнання, народ павінен падпарадкоўвацца іх загадам і не пярэчыць існуючай палітычнай мадэлі [2, с. 37–38, 50–51, 185–186, 439–443].

Больш памяркоўныя погляды меў Анджэй Фрыч Маджэўскі, сакратар Жыгімонта II Аўгуста і і палітычны пісьменнік. У сваім трактаце "De Republica emendanda" ("Аб выпраўленні Рэчы Паспалітай"), выдадзенай у 1577 г. у Лоску, ён не вылучаў ВКЛ у якасці аўтаномнай часткі дзяржавы і адпаведна з чым не вядзе пра яго асобнай гаворкі. Тым не менш трактат набыў папулярнасць і ў колах беларускіх інтэлектуалаў, з ім былі азнаёмлены Андрэй Волан і Сымон Будны. Маджэўскі з'яўляўся прыхільнікам цэнтралізаванай і ўніфікаванай дзяржавы, што ўяўляла бы сабой сімбіёз манархіі, арыстакратыі і паліты. Галоўнымі ўласцівасцямі такога ладу павінны быць сацыяльная справядлівасць і вяршэнства закона. Філосаф адмаўляў эксплуататарскі характар дзяржавы, імкнуўся да стварэння грамадства ўсеагульнага шчасця і радасці, выступаў супраць абсалютнай улады манарха і грамадскай няспраўядлівасці, якая супярэчыць чалавечай прыродзе. У творы падкрэсліваецца натуральная прага чалавека да актыўнага ўдзелу ў палітычным жыцці краіны. Рэч Паспалітая ва ўяўленні Маджэўскага гэта адзіны жывы арганізм, часткі якога няздольны існаваць паасобку і павінны выконваць

ускладзеныя на іх фукнцыі і абавязкі зарадзі ўсеагульнага дабрабыту [7]. Знакавым элементамі канцэпцыі Маджэўскага з'яўляюцца выступ супраць гвалтоўнага прыяднання новых тэрыторый і рэлігійная талеранцыю. Апошняя з пункту гледжання Вялікага княства з'яўляецца станоўчым фактарам, які не дасць палякам выкарыстаць у сваіхпалітычных мэтах каталіцкую царкву[2, с. 691].

У групу прыхільнікаў інкарпарацыі можна аднесці і каралеўскага сакратара Крыштофа Варшавіцкага, які выступаў за захаванне культурных асаблівасцей Вялікага княстваЛітоўскага, яе аўтаномію ў адміністрацыйных і судовых пытаннях, але без супярэчання агульнаму заканадаўству Рэчы Паспалітай. Варшавіцкі лічыў, што толькі магутны манарх, атрымаўшы ўладу ў спадчыну, можа забяспечыць дабрабыт свайму народу і абараніць ад свавольства цэнтралізаванага ўрада. Манарх павінен быць гарантам дабрадзейнасці і прававой справядлівасці. На думку Варшавіцкага, кароль здольны спалучаць у сабе клопат, як пра ўласны, так і народны дабрабыт. Філосаф выступаў супраць анархізму арыстакратыі і лічыў, што права павінна выконваць сваеасаблівую маралізатарскую і асветніцкую функцыю [2, с. 206].

У асобную катэгорыю можна вылучыць аўтара Мацея Стрыйкоўскага «Хронікі польскай, літоўскай, жамойцкай і усея Русі», выдадзенай у Краляўцы ў 1582 г. У сваёй хроніцы ён адзначаў агульнае паходжанне палякаў і літвінаў, гераізавана апісвае гісторыю Вялікага княства Літоўскага, услаўляў часы кіравання Гедзіміна і Вітаўта. Стрыйкоўскі станоўча ацэньваў падпісанне Люблінскай уніі для абодвух краін, разглядаючы яе як заканамерны этап дзяржаўна-палітычнага жыцця Вялікага княства, прадвызначаны яшчэ ў часы Ягайла і Вітаўта. У той жа час храніст рашуча асуджаў далучэнне Валыні да Польшчы, але і падкрэсліваў непарыўнасць лёсаў абодвух народаў: “Літва вялікую і значную дапамогу заўжды палякам давала, а як яны без палякаў, так і палякі без іх раздвоенымі будучы, мала б чаго слаўнага паасобку даказаць маглі”. [2, с. 604–605].

Палітычныя пісьменнікі Польскага каралеўства і Вялікага княства Літоўскага сярэдзіны – другой паловы XVI ст. не толькі адлюстроўвалі наяўныя погляды і свае ўласныя меркаванні і пачуцці наконт ідэальнай дзяржавы, дзяржаўнага ладу і характару будучай уніі. Азнаямленне не толькі кіруючых эліт, але больш шырокіх слаёў палітычных народаў абедзьвюх дзяржаў садзейнічала пошуку і дасягненню ўзаемнага кампрамісу, зафіксаванага ў акце Люблінскай уніі.

**Крыніцы і літаратура**


1. Akta unji Polski z Litwą 1385–1791 / Stanisław Kutrzeba, Władysław Semkowicz. – Kraków : Nakładem Polskiej Akademji Umiejętności i Towarzystwa Naukowego Warszawskiego, 1932. – LVI, 570 s. – URL: https://pbc.biaman.pl/publication/1419/ Akta unji Polski z Litwą, 1385–1791. pdf (дата обращения: 25.01.2026).

2. Гісторыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі. У 6 т. Т. 2. Протарэнесанс і Адраджэнне / С. І. Санько [і інш.] ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т філасофіі. – Мн. : Беларуская навука, 2010. – Т. 2: Протарэнесанс і Адраджэнне. – 840 с.

3. Саверчанка, І. Aurea mediocritas. Кніжна-пісьмовая культура Беларусі: Адраджэнне і ранняе барока / І. Саверчанка. – Мн. : Тэхналогія, 1998. – 319 с.

4. Кавалёў, С. Першы ўзор палітычнай паэзіі / С. Кавалёў // Спадчына. – 1998. – № 3. – С. 107–115.

5. Волан, А. Да палякаў і да ліцвінаў / А. Волан // Анталогія даўняй беларускай літаратуры: XI – XVIII стагоддзя / А. І. Богдан [і інш.]. – Мн. : Бел. навука, 2005. – 1015 с.

6. Падокшын, С. А. Унія. Дзяржаўнасць. Культура (Філасофска-гістарычны аналіз) / С. А. Падокшын. – Мн. : Беларуская навука, 2000. – 111 с.

7. Плюта, А. А. Мадыфікаваны арыстацелізм як падмурак для грамадска-палітычных канцэпцый Вялікага княства Літоўскага ў эпоху Адраджэння / А. А. Плюта // Веснік Полоцкого государственного университета – 2005. – № 6. – С. 107–115.